# Стылі маўлення

## § 6. Паглыбленне паняцця пра стылі маўлення. Стылеўтваральная роля вывучаных часцін мовы

**34.** Падрыхтуйце паведамленне, абапіраючыся на прыведзеную схему.




Для тэксту кожнага стылю ўласцівы свае прыметы: каму адрасаваны, з якой мэтай, дзе выкарыстоўваецца (сфера выкарыстання), характэрныя моўныя сродкі. Па гэтых асноўных прыметах і вызначаецца стыль пэўнага тэксту.

**35.** Прачытайце тэксты. Вызначце іх стыль і абгрунтуйце сваё меркаванне, абапіраючыся на прыметы кожнага стылю.

**I.** І вось зноў родныя мясціны сустрэлі мяне. Пад ялінамі — застаялы пах папараці. Я крочу сцежкай, на твар ліпне нябачнае павуцінне. Загуў у хвойках гуллівы ветрык, і дрэвы адгукнуліся шэптам, а мне здаецца, што ў іх кронах уздыхае вялізны асілак-тугадум. Здаецца, што я чую, як расце на палянах трава, адчуваю кожную былінку… *(Паводле В. Бялова)*.


Правообладатель Национальный институт образования

**II.** **«І на стол зьбяру»**

Жанчына прадае каштэлі, салодкія смачныя яблыкі, расказвае:

— У нас гэдакіх каштэляў — мы стаўпецкія, недалёка ад Стоўпцаў, — мо тоны дзве будзя. Прыедзяця — я й на стол зьбяру. І яблыкаў танней прадамо: дома ж, цягаць не трэба будзя.

— Як гэта «зьбераце на стол»?

— Ці сваяк, ці так чалавек трапіцца, то трэба сабраць на стол: каб чыста заслаць, каб наставіць на стол чаго толькі ёсць. І каб на здароўячка *(Ф. Янкоўскі)*.

**III.** **Вытрымкі з правіл бібліятэкі**

1. Білет абавязкова паказваць кожны раз пры ўваходзе ў бібліятэку і чытальную залу.
2. Перадача білета іншым асобам забараняецца.
3. Выносіць кнігі з чытальні ў іншыя пакоі забараняецца.
4. Чытачы бібліятэкі нясуць матэрыяльную адказнасць за атрыманыя кнігі.
5. Уваход у чытальныя залы з друкаванымі выданнямі, якія не належаць бібліятэцы, з папкамі, партфелямі, сумкамі забараняецца.

**IV.** Аглушэнне звонкіх зычных на канцы слоў і перад глухімі, азванчэнне глухіх перад звонкімі, прыпадабненне шыпячых да свісцячых і свісцячых да шыпячых на пісьме не перадаецца. Для праверкі напісання літары зычнага гука трэба падабраць роднаснае слова або змяніць яго так, каб пасля невыразнага зычнага стаў галосны: *просьба — прасіць, казка — казаць, грыб — грыбы, у лыжцы — лыжачка* («Практыкум па беларускай мове»).

**V.** «Маленства край! Ты з намі да скanання...» — так гаварыў пра Навагрудчыну Адам Міцкевіч, наш зямляк, геніяльны паэт. Гаворачы пра Навагрудчыну, ён думаў не толькі пра той куток, дзе нарадзіўся, дзе прайшлі яго маленства і юнацтва, — ён думаў пра Беларусь. І Беларусь ганарыцца Міцкевічам. Кожнае лета наш Навагрудак шчыра вітае мноства гасцей, якія прыходзяць



Правообладатель Национальный институт образования

сюды, да Міцкевіча... Шмат мясцін Навагрудскага краю помняць вялікага паэта! Помніць яго ўся Беларусь *(Паводле Я. Брыля)*.

**36.** Прачытайце тэкст. Абгрунтуйце яго прыналежнасць да навуковага стылю.

### Насельнікі вадаёмаў

Вадаёмы насяляе мноства відаў жывых арганізмаў. Рыбы, лічынкі некаторых насякомых (шыціка), малюскі (бяззубкі, смаўжы) жывуць у вадзе. Дыхаюць водныя жывёлы пры дапамозе жабраў раствораным у вадзе кіслародам. Насякомыя, малюскі і водарасці з'яўляюцца кормам для рыб, ракаў. Птушкі, што жывуць на балотах[л], жывяцца рыбамі, жабамі, насякомымі, водарасцямі. Буслы, качкі, кулікі прыстасаваны да жыцця ў водным асяроддзі. Вадаплаўныя птушкі маюць перапонкі паміж пальцамі ног. Іх пер'е не намакае ў вадзе, таму што змазана тлушчам. Яны добра ныраюць і могуць здабываць сабе корм у вадзе *(«Сусвет»)*.



Прааналізуйце сэнсава-стылістычную ролю назоўнікаў і дзеясловаў у тэксце. Абгрунтуйце мэтазгоднасць ужывання ў тэксце назоўнікаў (у тым ліку ў форме множнага ліку), а таксама дзеясловаў у форме 3-й асобы множнага ліку цяперашняга часу.

Разгледзьце ілюстрацыю да тэксту. Назавіце тых насельнікаў вадаёмаў Беларусі, якіх вы пазналі. Дапоўніце спіс назвамі вадаплаўных птушак.

**37.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго стыль, абгрунтуйце сваю думку.

Прыём у школу для асваення адукацыйнай праграмы агульнай сярэдняй адукацыі на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі ажыццяўляецца на падставе заявы на імя дырэктара школы і наступных дакументаў: пасведчання аб агульнай базавай адукацыі; даведкі аб паспяховасці, даведкі аб навучанні (акадэмічнай



Правообладатель Национальный институт образования

даведкі) — для асоб, адлічаных з устаноў, якія забяспечваюць атрыманне прафесійна-тэхнічнай або сярэдняй спецыяльнай адукацыі; даведкі аб стане здароўя, медыцынскай карты. Рашэнне[c] аб залічэнні для навучання ў адпаведным класе на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі афармляецца загадам дырэктара школы не пазней за 31 жніўня... *(З Правіл унутранага распарадку для навучэнцаў).*

● Выпішыце з тэксту моўныя сродкі, уласцівыя гэтаму стылю:

а) спецыяльная лексіка: *заява, даведка,* ... ;

б) пераважнае выкарыстанне назоўнікаў, утвораных ад дзеясловаў: *прыём, асваенне,* ... .

**38.** Прачытайце ўзор стылістычнага разбору тэксту (практ. 37). Дакажыце, што гэта тэкст-разважанне. Знайдзіце ў ім тэзіс, доказ тэзісу і вывад.

Гэты тэкст належыць да афіцыйнага стылю.

Па-першае, ён выкарыстоўваецца ў галіне справаводства, заканадаўства.

Па-другое, у ім вырашаецца задача, характэрная для афіцыйнага маўлення: даць канкрэтныя ўказанні, парады, прадпісанні, паведаміць пэўную інфармацыю.

Па-трэцяе, галоўнымі прыметамі гэтага тэксту з'яўляюцца дакладнасць і дэталёвасць выкладу, адсутнасць эмацыянальнасці і экспрэсіўнасці.

Па-чацвёртае, у тэксце выкарыстоўваецца спецыяльная лексіка (напрыклад: *заява, даведка, пасведчанне, прафесійна-тэхнічная або сярэдняя спецыяльная адукацыя*), пераважаюць назоўнікі, у тым ліку ўтвораныя ад дзеясловаў *(прыём, асваенне, рашэнне, навучанне, залічэнне...)*, сказы ўскладненай будовы і г. д.

Усе названыя прыметы ўласцівы афіцыйнаму стылю. Значыць, прапанаваны тэкст адносіцца да афіцыйнага стылю.

**39.** Выпішыце з любога вучэбнага дапаможніка для VII класа прыклад тэксту навуковага стылю. Падкрэсліце ў ім характэрныя для гэтага стылю моўныя сродкі.



Правообладатель Национальный институт образования